# ПРЭС-РЭЛІЗ

**Апісанне грашовых знакаў узору 2009 года і іх асноўныя прыкметы сапраўднасці**

У мэтах выканання пункта 5 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2015 г. № 450 ”Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь“ Праўленнем Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь прынята пастанова ад 17 лістапада 2015 г. № 676 ”Аб выпуску ў абарачэнне грашовых знакаў узору 2009 года і вывядзенні з абарачэння грашовых знакаў узору 2000 года“.

З 1 ліпеня 2016 г. у абарачэнне будуць выпушчаны банкноты і манеты ўзору 2009 года (далей – грашовыя знакі ўзору 2009 года) наступных наміналаў:

банкноты наміналам 5, 10, 20, 50, 100, 200 і 500 беларускіх рублёў;

манеты наміналам 1, 2, 5, 10, 20 і 50 беларускіх капеек, а таксама наміналам 1 і 2 беларускія рублі.

Агульная канцэпцыя дызайну новых банкнотаў адпавядае дэвізу ”Мая краіна – Беларусь“. Кожны банкнот прысвечаны адной з абласцей Беларусі і г. Мінску. У дызайне новых банкнотаў узору 2009 года захавана пераемнасць адносна банкнотнага раду ўзору 2000 года ў частцы выкарыстання выяў помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва.

**Банкнот наміналам 5 рублёў.**







Памер банкнота 135 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява Белай (Камянецкай) вежы, якая знаходзіцца ў г. Камянцы Брэсцкай вобласці, на адваротным – калаж, прысвечаны першым славянскім паселішчам (фрагмент скуранога пояса, драўлянае кола, малюнак старажытнага дзядзінца ”Бярэсце“).

**Банкнот наміналам 10 рублёў.**







Памер банкнота 139 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява Спаса-Праабражэнскай царквы, якая знаходзіцца ў г. Полацку Віцебскай вобласці, на адваротным – калаж, прысвечаны асветніцтву і кнігадрукаванню (кнігі, знак Францыска Скарыны, Крыж Еўфрасінні Полацкай, фрагмент арнаменту).

**Банкнот наміналам 20 рублёў.**






Памер банкнота 143 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява палаца Румянцавых і Паскевічаў у г. Гомелі, на адваротным – калаж, прысвечаны тэме духоўнасці (звон, Тураўскае Евангелле, старажытны горад Тураў, фрагменты разьбы).

**Банкнот наміналам 50 рублёў.**







Памер банкнота 147 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява Мірскага замка, які знаходзіцца ў г. п. Мір Гродзенскай вобласці, на адваротным – калаж, прысвечаны тэме мастацтва (ліра і лаўровыя галіны, пяро, папера, нотны стан).

**Банкнот наміналам 100 рублёў.**







Памер банкнота 151 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява замка Радзівілаў, які знаходзіцца ў г. Нясвіжы Мінскай вобласці, на адваротным – калаж, прысвечаны тэме тэатра і народных святаў (скрыпка, бубен, жалейка і сімвалы народных святаў: ”Калядная зорка“, каза, тэатр ”Батлейка“).

**Банкнот наміналам 200 рублёў.**







Памер банкнота 155 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава, на адваротным – калаж, прысвечаны тэме рамёстваў і горадабудаўніцтва (залаты ключ і пячатка г. Магілёва, кафля, фрагменты кованай рашоткі).

**Банкнот наміналам 500 рублёў.**






Памер банкнота 159 х 72 мм. На пярэднім баку банкнота размешчана выява Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, якая знаходзіцца ў г. Мінску, на адваротным – калаж, прысвечаны тэме літаратуры (пяро, чарніліца, вокладкі кніг, ліст папаратніку).

**Візуальныя прыкметы сапраўднасці банкнотаў узору 2009 года (на прыкладзе банкнота наміналам 20 рублёў).**

Банкноты выраблены на спецыяльнай паперы з хаатычна размешчанымі ў ёй ахоўнымі валокнамі сіняга і чырвонага колераў, а таксама жоўтага колеру, якія люмінісцыруюць ва ультрафіялетавых промнях.






1 2 3 4 5 6

**1. Вадзяны знак.** Злева ад асноўнай выявы на незадрукаваным полі размешчаны лакальны паўтонавы вадзяны знак, які паўтарае фрагмент асноўнай выявы пярэдняга боку банкнота.

**2. Ахоўная нітка.** Металізаваная аконнага (ныраючага) тыпу, якая выходзіць на паверхню пярэдняга боку банкнота ў выглядзе прамавугольнікаў, што ўтвараюць пункцірную лінію. Пры разглядванні банкнота на прасвет ахоўная нітка выглядае суцэльнай цёмнай паласой з негатыўным (светлым) тэкстам у прамой і перавернутай выяве.

**3. Пазнака для людзей з аслабленым зрокам.** Геаметрычныя фігуры, надрукаваныя ў левым ніжнім вугле пярэдняга боку банкнота, маюць павялічаную таўшчыню фарбавага слоя, дзякуючы чаму добра ўспрымаюцца навобмацак.

**4. Сумяшчальная выява.** Фрагменты выявы наміналу ўверсе злева на пярэднім і ўверсе справа на адваротным баках банкнотаў сумяшчаюцца на прасвет, утвараючы суцэльную выяву наміналу банкнота.

**5. Схаваная выява.** Пры разглядванні банкнота на прасвет у малюнку арнаменту, надрукаванага ў левай частцы пярэдняга боку банкнота, відаць выяву наміналу банкнота. (За выключэннем банкнотаў наміналам 5, 10 і 20 рублёў).

**6. Колерапераменная фарба (OVI).** Пры нахіле банкнота лічбы наміналу банкнота, надрукаваныя ў правым верхнім вугле адваротнага боку банкнота, мяняюць колер. (Толькі для банкнотаў наміналам 200 і 500 рублёў).

На аверсе (пярэднім баку) манет размешчаны відарыс Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, на рэверсе (адваротным баку) – лічбавыя абазначэнні наміналаў манет.




**Тэхнічныя характарыстыкі манет**

| Намінал | Дыяметр, мм | Маса, г | Таўшчыня, мм | Гурт | Колер |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 капейка | 15,00 | 1,55 | 1,25 | Роўны | Чырвоны |
| 2 капейкі | 17,50 | 2,10 | 1,25 | Роўны | Чырвоны |
| 5 капеек | 19,80 | 2,70 | 1,25 | Роўны | Чырвоны |
| 10 капеек | 17,70 | 2,80 | 1,80 | Насечка з сегментамі | Жоўты |
| 20 капеек | 20,35 | 3,70 | 1,85 | Насечка з сегментамі | Жоўты |
| 50 капеек | 22,25 | 3,95 | 1,55 | Насечка з сегментамі | Жоўты |
| 1 рубель | 21,25 | 5,60 | 2,30 | Насечка | Белы |
| 2 рублі | 23,50 | 5,81 | 2,00 | З надпісам | Колца – жоўты, сярэдзіна – белы |

***Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязей***
***Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь***